вое, творчае вучэнне, якое патрабуе пастаяннага развіцця. У СССР гэтае указанне класікаў было забыта: іх вучэнне паступова ператварылася ў догму, хаця сац. працэсы значна змяніліся ў параўнанні з папярэднімі эпохамі. Гэта негатыўна адбілася і на самой тэорыі, і на сац. практыцы. Са стварэннем незалежнай дзяржавы (1991) і прыняццем Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (1994), якая гарантуе разнастайнасць паліт. ін-таў, ідэалогій і думак, М.-л. перастаў быць дзярж. ідэалогіяй. Тым не менш ён па-ранейшаму ўвасабляецца ў светапоглядзе многіх грамадзян Беларусі і з'яўляецца аб'ектам даследаванняў грамадазнаўцаў.

*Літ.*: Очерки истории марксистско-ленинской философии в Белоруссии (1919—1968). Минск, 1968; Е ф р е м о в а О.И. Из истории общественной мысли Белоруссии конца XIX — начала XX в. Минск, 1972; Развитие марксистско-ленинской философии в БССР (20—70-е гг.). Минск, 1984; Теория и практика социализма и перспективы его в XXI веке. М., 2009; А д у л о Т.И. В поисках сущности бытия: философия на рубеже XX—XXI веков. Минск, 2011.

*Т.І.Адула.*

**МАРО́З**, Д з е д М а р о з, Л е д з я н ы д з е д, у славянскай, у т.л. і бел., міфалогіі дух продкаў, абаронца, галава роду; міфічная істота, якая ўвасабляе зімовы холад. Паводле павер'яў, М. прыходзіў людзям на дапамогу, клапаціўся аб добрым надвор'і, караў за дрэнныя паводзіны. Уяўляўся старым дзедам з чырвоным або сінім носам, сівымі валасамі і доўгай барадой. Быў апрануты ў снегавую сярмягу ці інш. вопратку светлага колеру і падпразаны белым поясам з чырвоным арнаментам. На нагах М. насіў сярэбраныя ці чырвоныя боты або белыя, шытыя сярэбранай ніткай валёнкі. Неад'емныя атрыбуты М. — жалезная булава, ад дотыку якой гінула ўсё жывое, а таксама мех для збору падношэнняў. Лічылася, што жыў М. у ледзяной хаце ў краіне мёртвых, куды можна было трапіць толькі спусціўшыся ў калодзеж. У бел. міфалогіі



*Да арт. **Мароз**. Беларускі Дзед Мароз. Белавежская пушча.*

М. на зямлю пасылаў бог зімы *Зюзя*. Ён укрываў снегам палі і лясы, каб уберагчы пасевы і дрэвы ад холаду, скоўваў лёдам рэкі, азёры, балоты, упрыгожваў інеем галіны дрэў і вокны хат. Каб задобрыць М., на Каляды яго запрашалі ў хату на першую абрадавую вячэру. Пры гэтым гаспадар прамаўляў: «Мароз, хадзі куццю есці! // І іржа, і бель, хадзіце цяпер! // А ўлетку ў нас не бывайце, // Хлеба нашага не ўбівайце». Лічылася, калі ў гэты час звярнуцца да М. яшчэ з якім-небудзь жаданнем, яно здзейсніцца. Вобраз М., які прыносіць падарункі, з'явіўся ў 19 ст. пасля апублікавання казкі «Дзіцячыя казкі дзядулі Ірынея» У.Адоеўскага (1840). У казцы М. за добрую працу адорваў жменяй сярэбраных манет, за дрэнную — ледзяшамі. Трансфармацыя слав. вобраза М. адбылася на аснове перапляцення слав. уяўленняў з традыцыямі Зах. Еўропы — верай у Санта Клауса, які нібыта жыве на Поўначы і кожны год на Раство прыходзіць з мехам падарункаў да дзяцей. У Беларусі афіц. рэзідэнцыя М. знаходзіцца ў Белавежскай пушчы і працуе зімой і ўлетку. Падчас навагодніх свят часовыя рэзідэнцыі М. дзейнічаюць у многіх гарадах Беларусі.

*П.А.Гуд.*

**МАРО́З**, персанаж усходнеславянскіх, у т.л. і бел., чарадзейных казак, вераванняў, прымавак. Узнік на падставе стараж. міфал. персаніфікацыі прыроднай стыхіі. У нар. уяўленнях М. невысокага росту, з доўгай сівой барадой, захутаны ў футра. Час яго ўладарання — зіма. У казках М. выконвае ролю чароўнага памочніка, які дапамагае чалавеку ў крытычнай сітуацыі. Так, у казцы «Як Мароз чалавека нагарадзіў за пшаніцу» М. абараняе беднага гаспадара ад сквапнага пана, а ў казцы «Марозка» ён карае дачку злой мачыхі, якая праклінае люты холад, і адорвае паслухмяную дзедаву дачку. У абрадавай практыцы беларусаў М. выступае як адна са стыхій, якой нароўні з душамі даўно памерлых людзі прыносілі абавязковую рытуальную ахвяру. На *Каляды* ў час застолля гаспадар зачэрпваў першую лыжку куцці, стукаў ёю ў сцяну ці акно і запрашаў: «Мароз, Мароз, хадзі куццю есці!», «Зімою прыходзь, а летам не хадзі, пад гнілою калодаю ляжы». Персаніфікацыя М. як прыроднай стыхіі ажыццяўляецца ў некаторых зімовых і восеньскіх песнях, як адчуванне нечага таямнічага.

*А.М.Аляхновіч.*

**МАРО́З** Валянціна Канстанцінаўна (н. 24.8.1955, в. Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага р-на), беларускі мовазнавец. Д-р філал. навук (2013). Скончыла Мінскі пед. ін-т (1976). Настаўнічала. З 1984 выкладала ў Брэсцкім пед. ін-це, з 1996 у Будапешцкім ун-це (1996—98). У 2001—10 у Бел. тэхнал. ун-це. З 2010 у Акадэміі Мін-ва ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь. Даследуе гісторыю бел. мовы на летапісным матэрыяле, лексіку і фразеалогію стараж. і сучаснай бел. мовы, праблемы культуры бел. літ. мовы, стылістыкі, методыку выкладання лінгв. дысцыплін, пед. аспекты выхавання моладзі. Аўтар манаграфій «Мова беларускага

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ